**Паўлава Алена Якаўлена** — кандыдат гістарычных навук, дацэнт; дацэнт кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў.

# ФОНД БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА АРХІВА-МУЗЕЯ ЛІТАРАТУРЫ І МАСТАЦТВА «ДЗЯРЖАЎНЫ МАСТАЦКІ МУЗЕЙ БССР» ЯК КРЫНІЦА ПА ВЫВУЧЭННІ ФАРМІРАВАННЯ ТРАДЫЦЫЙ КУЛЬТУРНА-АДУАЦЫЙНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ МАСТАЦКІХ МУЗЕЯЎ У САВЕЦКІ ПЕРЫЯД

***А. Я. Паўлава***

Изучаются возможности использования документов архивного фонда Государственного художественного музея БССР в качестве источника по истории культурно-образовательной деятельности музея в 1944—1984 гг.

*Ключевые слова*: популяризация произведений искусства; основная экспозиция; передвижные выставки; виды культурно-образовательной деятельности.

# ARCHIVAL FUND OF THE BELARUSIAN STATE ARCHIVE-MUSEUM OF LITERATURE AND ART AS THE HISTORICAL SOURCE FOR LEARNING ABOUT THE TRADITIONS OF THE SOVIET ART MUSEUMS CULTURAL AND EDUCATIONAL ACTIVITY

Author observes the complex of documents which are kept in archive-museum. The main topic of the article is the analysis of the exhibition and educational activities of the Belarusan state museum of fine arts in the post-war decades**.** Particular attention is paid to the types of educational communication.

*Keywords*: popularization of fine arts; cultural and educational activities; permanent exposition; mobile exposition.

Сёняшнія мастацкія музеі падчас сацыякультурных камунікацый удзельнічаюць у працэсе стварэння або пераасэнсаванні гарадской прасторы, аказваюць уплыў на эканамічны дабрабыт гарадоў, развіццё творчай індустрыі і культурнага прадпрымальніцтва, садзейнічаюць стварэнню брэнда горада, падтрымліваюць народныя промыслы. Сёння Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь з’яўляецца адной з найбольш запатрабаваных з боку публікі музейнай установай краіны. Падобны высокі статус музея з’яўляецца вынікам яго больш чым 70-гадовай актыўнай культурна-адукацыйнай дзейнасці, пра што свед-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

чаць матэрыялы фонда № 164 «Дзяржаўны мастацкі музей БССР», якi захоўваецца ў Беларускім дзяржаўным архіве-музеі літаратуры і мастацтва (БДАМЛМ).

Найбольшая частка матэрыялаў фонда № 164 прысвечана рабоце музея з аўдыторыяй, якая разглядалася ў якасці асноўнай кіраўніцтвам сферы культуры ў БССР. Як сведчаць захаваўшыеся ў БДАМЛМ дакументы музея за перыяд з 1944 па 1985 гг., асноўныя формы культурна-адукацыйнай работы сфарміраваліся менавіта ў азначаны перыяд. У планах музея паказвалася, што калектыў музея будаваў сваю працу так, каб максімальна задаволіць запыты працоўных у паглыбленні ведаў у галіне выяўленчага мастацтва, выхоўваць і развіваць эстэтычныя густы.

Першы перыяд пасляваеннай гісторыі быў для Дзяржаўнай мастацкай галерэі БССР значна больш цяжкім, чым, напрыклад, для музейных устаноў Масквы ці Ленінграда. Мінск быў зруйнаваны, галерэя месцілася ў памяшканнях Дома прафсаюзаў. Як вынікае з дакументаў супрацоўнікі галерэі актыўна спалучалі экспазіцыйную і культурна-адукацыйную дзейнасць. Яшчэ да завяршэння будаўніцтва ўласнага будынка, галерэя займалася актыўнай прапагандай выяўленчага мастацтва [15, арк. 4—5]. Прадугледжавалася распрацоўка экскурсій па наяўнай экспазіцыі, арганізацыя перасоўных выставак [1, арк. 1—2; 5, акр. 1—6; 11, арк. 12—14; 14]. Музей актыўна выкарыстоўваў памяшканні іншых устаноў культуры: файе Тэатра оперы і балета , кінатэатраў і інш. [16, арк. 26]

Кіраўніцтва культурай СССР патрабавала ад мастацкіх музеяў краіны сумяшчаць культурна-адукацыйныя мерапрыемствы і выстаўкі твораў выяўленчага мастацтва з мэтай далучэння да сусветнай спадчыны ўсіх катэгорый наведвальнікаў, у т. л. вайскоўцаў і жыхароў сельскай мясцовасці [4, арк. 17]. Тэматыка выставак вызначалася надзённымі ідэялагічнымі задачамі. Аднак, рэалізоўваліся таксама цікавыя неідэялагізаваныя праекты, такія як выстаўка рэпрадукцый да стагоддзя Цы-Байшы, арганізаваная ў клубе Мінскага аўтазавода [6, арк. 7—9].

Менавіта перасоўныя выстаўкі адыгралі значную ролю ў пашырэнні папулярызацыі беларускага мастацтва [4, арк. 23—25]. На працягу 1969 г. графічныя выстаўкі дзейнічалі ў Гродна, Лідзе, Баранавічах, Пінску, Брэсце, Белаазёрску, Браславе, у Мінску (у кінатэатры «Навіны дня», парку імя М. Горкага і інш.) [6, арк. 23—25]. За перыяд з 1976 па 1979 гг. перасоўныя выстаўкі Дзяржаўнага мастацкага музея БССР экспанаваліся ў 355 населенных пунктах. Сярод тэм перасоўных выставак пачатку 1980-х гг. можна выдзяліць наступныя: «Беларускія народныя тканіны», «Беларускі жывапіс», «Беларускі пейзаж і нацюрморт»,



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

«Беларуская графіка» [29, арк. 18]. Негледзячы на рэальныя поспехі ў дзейнасці перасоўных выставак, існавалі сур'ёзныя праблемы падчас іх арганізацыі: недахоп плошчаў і спецыялізаваных выставачных залаў, а таксама небяспечныя ўмовы захавання, выпадкі шкодніцтва ў дачыненні да перасоўнага фонда і крадзяжы рэпрадукцый.

Паміж савецкімі рэспублікамі пастаянна адбываліся абменныя выстаўкі выяўленчага мастацтва. Упершыню беларускае мастацтва ў 1955 г. дэманстравалі на перасоўнай выстаўке у Каўнасе [3, арк. 2]. За чатыры пасляваенныя дзесяцігоддзі жыхары амаль усіх рэспублік СССР атрымалі магчымасць пазнаёміцца з творамі розных жанраў беларускага выяўленчага мастацтва: Латвія і Узбекістан (1960-я гг.), Арменія (1980 г.), Казахстан (1981 г.), Грузія, Літва, Малдавія, Расія (1983 г.) [9, арк. 27; 13, арк. 1—19; 26, арк. 7—8]. Значным праектам стала арганізацыя сумесна з Саюзамі мастакоў Расіі і Украіны арганізацыя ў 1982 г. выстаўкі да 1500-годдзя г. Кіева «СССР — наша Радзіма» [28, арк. 20] .

Аснову пасляваеннай пастаяннай экспазіцыі склалі калекцыі рускага і беларускага мастацтва [2, арк. 12—14]. Аднак, як сведчаць архіўныя матэрыялы, да 1965 г. у мастацкім музеі БССР не было пастаяннай экспазіцыі беларускага мастацтва. Аднак, па стану на пачатак 1980-х гг. у музеі існавала пастаянная экспазіцыя, прысвечаная беларускаму мастацтва XVI—XX стст. У сярэднім супрацоўнікі штогадова ладзілі 10 стацыянарных выставак і рыхтавалі 15—19 камплектаў перасовак. Можна лічыць, што на 1970—1985 гг. прыпадае пік выставачнай дзейнасці Дзяржаўнага мастацкага музея. Стацыянарныя выстаўкі пашыраліся і колькасна і тэматычна: персанальныя выстаўкі беларускіх мастакоў, выстаўкі да юбілеяў выбітных дзеячоў культуры і гістарычных падзей; выстаўкі з калекцый замежных музеяў (ЗША, Францыя, Аўстрыя, Балгарыя) і музеяў рэспублік СССР [14, арк. 158; 19, арк. 1—3; 20, арк. 8; 22, арк. 3—4 і 8—9; 23, арк. 2—9; 26, арк. 9—11]. Паралельна музей арганізоўваў за межамі БССР выстаўкі беларускага мастацтва. У 1981 г. выстаўка «Беларускі жывапіс» адбылася ў Венгрыі і ФРГ, выстаўка «Беларуская графіка» — у Францыі і Эфіопіі [26, арк. 11]. У 1983г. выстаўка «Беларускі жывапіс» прайшла с поспехам у Фінляндыі, а «Беларуская графіка» — у Грэцыі і Чэхіі [29, арк. 12]. Актыўная выставачная дзейнасць праводзілася і ў філіялах музея: народнае мастацтва Беларусі паказвалі ў Раўбічах, беларускі сучасны жывапіс — у Гурынах [27, арк. 9—11; 28, арк. 19—20].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Галоўным дасягненнем Дзяржаўнага мастацкага музея БССР у галіне культурна-адукацыйнай дзейнасці можна лічыць наладжаную работу па папулярызацыі выяўленчага мастацтва сярод розных сацыяльна-узроставых катэгорый насельніцтва. Для паспяховай рэалізацыі адукацыйнай функцыі, распрацоўкі методык і зместа канкрэтных форм гэтай работы ў музеі ажыццяўлялася вывучэнне музейнай аўдыторыі. У большасці штогадовых справаздач выдзяляюцца наступныя групы наведвальнікаў: рабочыя, служачыя, школьнікі, студэнты, ваеннаслужачыя [10, арк. 152].

У мінулыя дзесяцігоддзі была закладзена добрая традыцыя сустрэч майстроў выяўленчага мастацтва з наведвальнікамі. На працягу 1959 г. сіламі музея былі арганізаваны і праведзены сустрэчы з мастакамі і скульптарамі: З. І. Азгурам, Е. А. Зайцавым, А. В. Волкавым, А. К. Глебавым, Е. Е. Красоўскім. На гэтыя сустрэчы былі запрошаны прадстаўнікі розных катэгорый наведвальнікаў: школьнікі, сябры гуртка выяўленчага мастацтва Палаца піянераў, настаўнікі школ, сябры гуртка вышывальшчыц. У 1970 г. былі наладжаны сустрэчы з І. Я. Міско, В. К. Цвірко, у 1979 г. — з М. А. Савіцкім, Л. Д. Шчамялёвым, В. К. Гоманавым і інш. [5; 17, арк. 4—7].

Для папулярызацыі мастацтва сярод рабочых і служачых (на камвольным камбінаце, фабрыцы мастацкіх вырабаў, заводзе аўтаматычных ліній, МАЗе, МТЗ) на працягу 1974 г. супрацоўнікі музея чыталі лекцыі па гісторыі рускага і беларускага мастацтва, асаблівасцях успрыняцця жывапісу), праводзілі перасоўныя выстаўкі прама ў вытворчых памяшканнях, радыёзаняткі па мастацтву з выкарыстаннем ўнутранніх фабрычных радыёвузлоў [5, арк. 17].

На базе музея для пашырэння ведаў насельніцтва ў галіне мастацтва былі арганізаваны Стасаўскія чытанні і сустрэчы ў музейных залах, прысвечаных беларускаму савецкаму мастацтву [20, арк. 1]. Акрамя разавых лекцый, музей арганізоўваў серыйныя мерапрыемствы па пашырэнню ведаў насельніцтва ў галіне выяўленчага мастацтва. Спецыялізаваныя лекторыі дзейнічалі для рабочых аўтамабільнага завода, супрацоўнікаў НДІ парашковай металургіі, студэнтаў палітэхнічнага інстытута і г. д. У 1972 г. у музеі урачыстай тэматычнай вечарынай адзначылі 100-годдзе з дня нараджэння знакамітага беларускага мастака В. К. Бялыніцкага-Бірулі [18, арк. 1]. У 1980-я гг. да ўжо пазначаных раней форм культурна-адукацыйнай дзейнасці далучыліся лекторыі выхаднога дня.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Сёння мы звыклыя да з’яўлення рэпрадукцый твораў мастацтва на фасадах будынкаў ці ў парках. Сярод пачынальнікаў гэтай традыцыі стаіць Дзяржаўны музей БССР. Для пашырэння магчымасцяў простых людзей пазнаёміцца з гісторыяй, накірункамі і творамі мастацтва музей арганізаваў пастаянныя кіналекторыі, якія дзейнічалі ў Зялёным тэатры парка культуры імя М. Горкага і на Трактарным заводзе. Перад дэманстрацыяй навуковых кінастужак адбываліся сустрэчы наведвальнікаў з навуковымі супрацоўнікамі музея, а таксама рэпрадукцыямі твораў [5, арк. 19].

Многія мінчане ведаюць, што апошняя серада кожнага месяца — гэта дзень адкрытых дзвярэй у Нацыянальным мастацкім музеі. Упершыню у гісторыі музея падобныя дні вольнага ўваходу з’явілася ў 1959 г. У 1978 г. падобныя акцыі адбываліся двойчы [24, арк. 153]. А ў 1983 г. іх было 6 [27, арк. 153].

Трэба прызнаць станоўчым той факт, што вялікая ўвага ў савецкі час надавалася папулярызацыі ведаў аб выяўленчым мастацтве сярод жыхароў сельскай мясцовасці [4, арк. 26—27]. Калгаснікі знаёміліся з шэдэўрамі сусветнага і айчыннага мастацтва. Для іх чыталі лекцыі «Творчасць Леанарда да Вінчы», «Творчасць Рубенса», «Прыкладное мастацтва Беларусі» і інш. [15, арк. 3] У другой пал. 1970-х — першай пал. 1980-х гг. музей выязджаў з перасоўнымі выстаўкамі ў раёны Гродзенскай і Мінскай абласцей [27, 29].

Сярод асноўных формаў сацыякультурнай дзейнасці музея вылучаецца рэкламнае інфармаванне. Першыя згадкі пра рэкламную дзейнасць мастацкай галерэі адносяцца да канца 1940-х гг. Музей друкаваў плакаты і афішы, якія расклейваліся на гарадскіх рэкламных шчытах. Супрацоўнікі музея падрыхтавалі спецыяльны рэкламны артыкул аб музеі, яго калекцыях і выстаўках для пуцяводніка па г. Мінску, які выдавала дзіцячая турыстычная база [5, арк. 21]. Добрай знаходкай арганізатараў перасовак можна лічыць стварэнне спецыяльных камплектаў, распавядаючых пра дзейнасць Дзяржаўнага мастацкага музея БССР. Так, з нагоды святкавання 25-годдзя аднаўлення музея пасля вайны, яго Вучонай радай былі падрыхтаваны камплекты перасоўных фотавыставак для экспанавання на прадпрыемствах Мінска [7. арк. 40; 9, арк. 32]. Безумоўна, у савецкі час з мэтай інфармавання пра сваю дзейнасць вядучыя музейныя ўстановы актыўна выкарыстоўвалі таксама адміністратыўны рэсурс. Улёткі і афішы музея распаўсюджваліся падчас правядзення метадычных нарад для супрацоўнікаў устаноў адукацыі, супрацоўнікі музея праводзілі для слухачоў азнаямляльныя рэкламныя



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

экскурсіі [5, арк. 20]. Для распаўсюджвання інфармацыі аб сваіх мерапрыемствах музей усё часцей выкарыстоўваў тэлебачанне [15, арк. 5]. Разумеючы важнасць мастацкага музея для сферы культурнага турызма і папулярызацыі беларускага мастацтва, кіраўніцтва сферы культуры рэспублікі наладзіла ў ім у 1980-я гг. заняткі для гідаў «Інтурыст» [25, арк. 7].

На працягу 1950-х — 1980-х гг. Дзяржаўны мастацкі музей БССР надаваў значную ўвагу папулярызацыі выяўленчага мастацтва сярод падрастаючага пакалення. Вялікая колькасць мерапрыемстваў арганізоўвалася спецыяльна для школьнікаў. Музей актыўна выкарыстоўваў разнастайныя формы і метады музейна-педагагічнай дзейнасці: ад класічных экскурсій і лекцый да мастацтвазнаўчых гурткоў і спецыялізаваных музейна-педагагічных праграм. Цікавай знаходкай трэба прызнаць арганізацыю перасоўных выставак у летніх лагерах. Магчыма, улічваючы выключна забаўляльную накіраванасць сучасных дзіцячых аздараўляльных лагераў, мае сэнс гэты вопыт аднавіць, выкарастоўваючы важатых — студэнтаў ВНУ Міністэрства культуры. Правядзенне с дзецьмі інтэрактыўных летніх праграмм з выкарыстаннем ІТ (віртуальны тур па залах музея) дазволіла б разлічваць на павялічэнне сямейных наведвальнікаў па завяршэнні сезону адпачынкаў. Асобныя праграмы былі распрацаваны і для педагогаў сярэдніх школ, напрыклад, семінар «Што дае наведванне мастацкага музея для эстэтычнага выхавання школьнікаў?» [6, арк. 5]. Калектыў навуковых супрацоўнікаў распрацаваў шэраг тэматычных лекцый і экскурсій для школьных груп, а таксама метадычныя семінары для педагогаў аб формах азнаямлення навучэнцаў з выяўленчым мастацтвам. [5, арк. 1].

«Эстэтычнае выхаванне» моладзі было адной з важных складаючых «камуністычнага выхавання працоўных» у БССР. Як бачна з гадавых справаздач, у мэтах папулярызацыі мастацтва сярод школьнікаў толькі ў 1959 г. у музеі 17 разоў праводзіліся піянерскія зборы, прысвечаныя выяўленчаму мастацтву [5, арк. 20]. На жаль, сёняшні БРСМ не праяўляе цікавасці да прыгаданага накірунку дзейнасці. Супрацоўнікі музея распрацавалі цыкл экскурсій і лекцый для школьнікаў рознага ўзросту. На працягу ўсіх пасляваенных дзесяцігоддзяў перасоўныя выставы экспанаваліся ў школах г. Мінска. Асобныя экскурсіі і лекцыі праводзіліся для настаўнікаў. Выязныя экскурсіі па спецыяльна падрыхтаваных перасоўных выстаўках і лекцыі па гісторыі мастацтваў у школах БССР праводзілі вядучыя спецыялісты музея [14].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Падсумаваўшы вопыт работы з падрастаючым пакаленнем, у лістападзе 1974 г. кіраўніцтва музея падрыхтавала для ЦК КПБ службовы допіс «Аб рабоце музея са школьнікамі». У ім Дзяржаўны мастацкі музей БССР прапанаваў школам уключыць у вучэбныя планы абавязковае наведванне мастацкага музея; у сістэму павышэння кваліфікацыі настаўнікаў літаратуры і гісторыі ўключыць сістэматычныя заняткі ў лекторыі музея. Выказвалася пажаданне Міністэрству адукацыі рэспублікі давесці да ведама настаўнікаў літаратуры, гісторыі, малявання і класных кіраўнікоў планы працы музея са школьнікамі (музей па сваёй ініцыятыве рассылаў буклеты «У дапамогу школе» па ўсіх школах горада, але яны, большай часткай аселі ў кабінетах дырэктараў). Супрацоўнікі музея разумелі эстэтычнае выхаванне не як разавае наведванне, а наведванне класам на працягу года цыкла лекцый або цыкла экскурсій. Для таго, каб настаўнікі маглі прыводзіць школьнікаў у музей, прапанавалася адвесці ў вучэбных планах для гэтага спецыяльныя гадзіны [26, арк. 26].

Трэба адзначыць, што сёння вельмі папулярным сярод дзяцей і бацькоў з'яўляецца гурток Нацыянальнага мастацкага музея «Цюбік». Папярэднік сёняшняга «Цюбіка» — гурток юных мастацтвазнаўцаў, пачаў дзейнічаць з верасня 1959 г. [5, арк. 1]. Акрамя яго, падобныя гурткі юных мастацтвазнаўцаў былі створаны з дапамогай супрацоўнікаў музея у школах, школах-інтэрнатах, пры мастацкіх студыях. Гэтыя гурткі вялі такія спецыялісты як Н. Ф. Высоцкая, Т. А. Рэзнік, Т. А. Карповіч, Р. Г. Бадзін, Э. Г. Казлова, М. А. Шчарбакова і інш. [5, арк. 153].

У 1970-я гг. у музеі ўжо працавалі тры гурткі для школьнікаў 8—10 класаў [21, арк. 4]. Як правіла, склад слухачоў у іх захоўваўся на працягу трох гадоў. Гурткоўцы слухалі лекцыі, знаёміліся з работай розных аддзелаў музея (рэстаўрацыйнымі майстэрні, фондамі), а таксама формамі навуковай працы), рыхтавалі самастойныя працы па аналізе твораў, якія экспанаваліся ў залах музея, рэгулярна з кіраўнікамі гурткоў (навуковымі супрацоўнікамі музея) наведвалі мастацкія выставы, сустракаліся з беларускімі мастакамі ў майстэрнях, у т. л. з З. І. Азгурам, М. В. Данцыгам, Г. Г. Паплаўскім, В. Г. Гаўрылавым. Тэмы заняткаў ў майстэрнях былі звязаны з відамі і жанрамі мастацтва, яго гісторыяй. Найбольш папулярнымі тэмамі для гурткоў былі «Шэдэўры сусветнага мастацтва», «Архітэктура як від мастацтва», «Як правільна глядзець на карціны».

У 1984 г. вопыт работы гурткоў юных мастацтвазнаўцаў быў пашыраны і на створаныя філіялы музея. У Мазырскай СШ № 7 дзейнічаў гур-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ток аматараў мастацтваў для вучняў 5—7 класаў. У мастацкай студыі г. Магілёва, Мастацкі музей В. К. Бялыніцкага-Бірулі стварыў гурток мастацтвазнаўцаў [8, арк. 15]. Акрамя гуртка юных мастацтвазнаўцаў, у Дзяржаўным мастацкім музеі працавалі гурткі «Юны экскурсавод» і «Лепка».

Важным дасягненнем культурна-адукацыйнай дзейнасці прыгаданага перыяду была арганізацыя выставак твораў выяўленчага мастацтва беларускіх дзяцей, выстаўка «Мастацтва — дзецям», выстаўка ілюстрацый беларускіх мастакоў да дзічячай літаратуры (сёння падобнага рода выстаўкі арганізуе Нацыянальная бібліятэка) [29, арк. 8—10]. Фінальная частка падобных мерапрыемстваў, як правіла, праводзілася на базе мастацкага музея. Яго кіраўніцтва адказвала за выданне каталогаў выставак, рапрацоўку і выданне афіш і запрашальных білетаў на адкрыццё, рэкламу на радыё і размяшчэнне афіш на тумбах [11, арк. 1—10; 13, арк. 1—19].

Такім чынам, комплекс дакументаў, які адклаўся ў фондзе № 164 БДАМЛМ «Дзяржаўны мастацкі музей БССР» дазваляе сцвярджаць, што на працягу чатырох пасляваенных дзесяцігоддзяў гэты музей быў актыўна ўключаны ў сістэму тагачасных культурных і мастацкіх камунікацый, з’яўляючыся не толькі сацыяльным інстытутам, але значнай формай актуалізацыі мастацкай рэчаіснасці ў культуры. Мастацкі музей не быў элітарнай культурнай установай і выкарыстоўваў разнастайныя формы дзейнасці, многія з якіх засталіся актуальнымі і сёння. Яны паспяхова мадэрнізаваны з улікам сённяшніх рэалій і актыўна выкарыстоўваюцца для папулярызацыі выяўленчага мастацтва.

## БІБЛІЯГРАФІЧНЫЯ СПАСЫЛКІ


1. БДАМЛіМ. Ф. 164. Воп. 1. Спр. 17.
2. Там жа. Спр. 55.
3. Там жа. Спр. 66.
4. Там жа. Спр. 77.
5. Там жа. Спр. 83.
6. Там жа. Спр. 89.
7. Там жа. Спр. 107.
8. Там жа. Спр. 127.
9. Там жа. Спр. 128.
10. Там жа. Спр. 135.
11. Там жа. Спр. 146.
12. Там жа. Спр. 147.
13. Там жа. Спр. 153.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

14. Там жа. Спр. 158.
15. Там жа. Спр. 170.
16. Там жа. Спр. 177.
17. Там жа. Спр. 185.
18. Там жа. Спр. 196.
19. Там жа. Спр. 208.
20. Там жа. Спр. 214.
21. Там жа. Спр. 217.
22. Там жа. Спр. 257.
23. Там жа. Спр. 259.
24. Там жа. Спр. 264.
25. Там жа. Спр. 274.
26. Там жа. Спр. 285.
27. Там жа. Спр. 291.
28. Там жа. Спр. 294.
29. Там жа. Спр. 297.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ